Завецца ж спадчына мая ўсяго старонкай роднаю
Янка Купала

Маладзечанская газета

Газета ўзнагароджана:
Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР,
Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Грамадска-палітычнае выданне.
Заснавана ў верасні 1939 года
СЕРАДА
30
сакавіка
2016 года
№24 (12267)
mgazeta.by
Кошт у розніцу:
серада – 1100 рублёў,
субота – 4100 рублёў.

# Дзесяць тысяч долараў за ідэю

**КАРЫСНЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ**

**На базе гімназіі-каледжа мастацтваў адбыўся кірмаш маладзёжных ідэй па ўстойлівым развіцці нашага раёна.**

Рэспубліканскі праект распачаўся летась пад эгідай ЕС/ПРААН для падтрымання крэатыўных ініцыятыў на мясцовым узроўні. Было пададзена больш за 700 заявак як ад вучнёўскіх, так і працоўных калектываў, арганізацый і прадпрыемстваў рознай формы ўласнасці. У пачатку гэтага года 87 ініцыятыў атрымалі фінансаванне для далейшай рэалізацыі. Гімназія-каледж мастацтваў адзначана грантам у памеры 10500 долараў. У якасці партнёраў выступілі Красненская, Палачанская, Хажоўская школы і адпаведныя сельскія Саветы, аддзел адукацыі, спорту і турызму райвыканкама, а таксама рэспубліканская асацыяцыя «Адукацыя для ўстойлівага развіцця» (г. Мінск).

— Мы прапанавалі ініцыятывы, накіраваныя на развіццё эканамічнай, экалагічнай і валанцёрскай дзейнасці на Маладзечаншчыне, — зазначыла намеснік дырэктара гімназіі-каледжа мастацтваў Алена Храмцэвіч, якая з'яўляецца каардынатарам дзейнасці каманды педагогаў і навучэнцаў у рамках праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». – Сярод задум прадстаўнікоў нашай установы – актывізацыя валанцёрства і, у прыватнасці, дапамога дзецям з асаблівасцямі развіцця. Красненцы ініцыююць стварэнне альбома сямейных рэліквій, а таксама збіраюцца больш актыўна прапагандаваць здаровы лад жыцця. Палачанцы захопленыя краязнаўствам і спадзяюцца абудзіць цікавасць да гісторыі роднага краю ў іншых. У іх нават распрацаваны турыстычны маршрут. Педагогі і вучні з Хажоўскай школы маюць намер паўплываць на недапушчэнне дзіцячага насілля ў сем'ях.

У маі запланаваны раённы фестываль маладзёжных ініцыятыў. Да гэтага часу каманда педагогаў і навучэнцаў, якія працуюць у рамках праекта ЕС/ПРААН, спадзяюцца ажыццявіць частку задум.

Ірына **РАБУШКА.**